# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА У. А. КАЗЛОЎСКАГА



**У. А. Казлоўскі, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – чэрвень 1944 г.

**Месца дзеяння:**

электрастанцыя г. Віцебска

**Колькасць:**

невядома

**Кіраўнікі:**

Казлоўскі Уладзімір

Дзейнічала на электрастанцыі з ліпеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. Кіраўнік У. А. Казлоўскі быў пакінуты Віцебскім ГК ЛКСМБ для падпольнай работы ў Віцебску. У групу ўваходзілі: бацька Казлоўскага Аляксандр Данатавіч, маці Лізавета Данілаўна, брат Аляксандр, М. А. Жыдовіч і інш.

У першыя дні вайны У. А. Казлоўскі быў арганізатарам маладзёжных атрадаў народнага апалчэння, у абарончых баях быў паранены. З чэрвеня 1942 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам Віцебскіх падпольных абкама і гаркама камсамола, мела сувязь з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А. Ф. Данукалава). Жыдовіч, а пасля яе гібелі ў маі 1943 г. яе маці Д. І. Кузьміна дастаўлялі патрыётам партызанскай брыгады міны, узрыўчатку, забяспечвалі партызан разведінфармацыяй, прывялі ў атрад 25 ваеннапалонных.

У. А. Казлоўскі слухаў па радыёпрыёмніку зводкі Саўінфармбюро, запісваў іх, потым члены групы гэтую інфармацыю размнажалі і распаўсюджвалі. Працуючы электраманцёрам на электрастанцыі, ён узарваў дзве трансфарматарныя будкі, здзейсніў дзве дыверсіі на падстанцыі, замініраваў танк.

28 кастрычніка 1942 г. Уладзімір Казлоўскі і яго бацька загінулі пры выкананні задання: наводзілі светлавымі сігналамі савецкія самалёты на электрападстанцыю, чым выклікалі агонь на сябе. Члены групы, якія засталіся, працавалі пад кіраўніцтвам партызанскай брыгады «Аляксея». Аляксандр Казлоўскі заставаўся ў падполлі да вызвалення горада, загінуў на фронце.

Кіраўнік групы і М. А. Жыдовіч узнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група У. А. Казлоўскага / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 486.

2. **Подпольная** группа Козловского В. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 288.

3. **Правда** против лжи // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 105–115.